***Тэкст дыктанта***

***для правядзення ўступных іспытаў па беларускай моее***

***ў 9 клас Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча***

## Мірскі замак

Мірскі замак — помнік, узведзены ўмелымі рукамі беларусаў. За грошы багатых князёў будавалі, рамантавалі, аднаўлялі замак.

А стваралі тую казачную забудову ўмелыя рукі мясцовых і прывазных майстроў. Яны рабілі вежы, гарматныя байніцы, пад'ёмныя масты, узводзілі вінтавыя лесвіцы, клалі керамічную падлогу, тынкавалі і бялілі сцены, выштукоўвалі ўзорны арнамент.

Замак у Міры — удзельнік усіх войнаў, якія зведала наша пакутная беларуская зямля. Яго разбуралі, палілі, бралі штурмам рускія, французскія, шведскія, нямецкія войскі. У Другую сусветную вайну фашысты стварылі ў разбураным замку лагер для ваеннапалонных. А пры адступленні спалілі ў замку ўсё, што гарэла.

Беларусь залячыла раны мінулай вайны. Знайшліся сродкі і для аднаўлення велічнага Мірскага замка. Старажытныя вежы, сцены, вокны байніц, брукаваная падлога — усё прымушае задумацца і беларускага, і замежнага вандроўніка пра наша агульнае мінулае. *(123 словы).*

*Паводле У. Ліпскага*